грамадства будзе кансерватыўным і няздольным на адэкватную неабходнасць мадэрнізацыі, а тым болей культурныя дасягненні (у навуцы, мастацтве, тэхніцы або рэлігіі). Захопленасць навацыямі, прага пастаянных перамен, адсутнасць належнага шанавання сваіх продкаў таксама парушаюць неабходны баланс паміж традыцыяй і ідэалам, г. зн. паміж размеркаваннем усёй культурнай энергіі, якой валодае дадзенае грамадства. Таму баланс паміж традыцыяй і ідэалам, паміж мінулым і будучым у культуры — гэта перш за ўсё баланс усяго сацыякультурнага свету, здольнага не толькі на захаванне згуртаванасці і выжыванне ва ўмовах ціску знешняга асяроддзя, але і на культурнае развіццё, г. зн. на магчымасць сукупнага грамадскага дзеяння, якое заўсёды становіцца гістарычным. Такім чынам, паняцце сацыякультурнага балансу набывае важнейшае значэнне не толькі як адно з галоўных паняццяў у даследаванні культуры, але і ў якасці магчымай асновы новага метадалагічнага аналізу культуры, успрымаемай як адзінства чалавека, грамадства, працэсаў і вынікаў іх дзейнасці.

**І.М. Шумская,**
*аспірантка*

## ПРАБЛЕМА ТВОРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВА ЎМОВАХ ДАМІНАВАННЯ МАСАВАЙ КУЛЬТУРЫ

Новая грамадска-палітычная сітуацыя, якая склалася ў былых саюзных рэспубліках напрыканцы 80-х гадоў, развіццё дэмакратыі і галоснасці, пераход на рынычныя адносіны дазволілі пераадолець шматлікія ідэалагічныя і дагматычныя традыцыі як у функцыяніраванні культуры і мастацтва увогуле, так і ў эстэтычным выхаванні чалавека ў прыватнасці. Аднак новыя сацыяльныя ўмовы стварылі сур'ёзныя маральныя, псіхалагічныя і эстэтычныя праблемы ў мастацкай культуры. Усе яны патрабуюць навуковага асэнсавання.

Вядомы іспанскі філосаф Хасэ Артэга-і-Гасет у адной са сваіх прац адзначаў, што ў сучасны перыяд у чалавечым жыцці дамінуюць тры "М": масавае грамадства, сродкі мас-медыя і масавая культура (7). Бясспрэчна, гэтыя "тры кіты" вылучаюцца і на агульным фоне сацыякультурнай парадыгмы, якая мае месца ў дадзены момант у Беларусі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Варта адзначыць, што як сацыяльная з'ява масавая культура ў той ці іншай форме існавала заўсёды. Да яскравых прыкладаў яе можна аднесці бойкі гладыятараў, калектыўныя малебны і нават інквізітарскія вогнішчы. Але прыярытэтную ролю масавая культура пачала адыгрываць толькі ў XX ст.

Канкурэнцыя на ўзроўні масавай свядомасці савецкіх, нацыянальных і так званых заходніх ідэйных дамінантаў прывяла большую частку насельніцтва ў стан фрустрацыі, няўпэўненасці ў заўтрашнім дні, апатыі ў адносінах да жыцця. Разам з пераходам да рыначных адносін наша грамадства пачало міжволі запазычваць жыццёвыя прынцыпы і арыенціры, якія склаліся ў менталітэце чалавека Захаду. Сярод іх варта адзначыць наступныя: эмпірызм, рацыяналізм, прагматызм, пазітывізм, індывідуалізм. Сфарміравалася пэўная мадэль духоўнага быцця людзей: агрэсіўнасць стала характэрнай рысай сучаснага чалавека, канфліктнасць – тыповай з'явай у мікра- і макрамаштабах, эгацэнтрызм – пераважным відам міжасобасных зносін, сілавы прынцып – галоўным спосабам рэгулявання сацыяльных сувязей. Парадаксальнасць існавання ў цяперашні час заключаецца ў тым, што перажыванне гіпертрафіраванага індывідуалізму суправаджаецца жорсткай дэперсаналізацыяй. У выніку адбываюцца няспыннае ўзнаўленне псіхічнага дыскамфорту, абвастрэнне трагізму ўнутранай адзіноты на фоне буму камунікацый. Татальнае раз'яднанне сувязей паміж чалавекам і прыродай, паміж людзьмі, краінамі і народамі, а таксама сэрцам і розумам, ідэалам і рэчаіснасцю прывяло да парушэння ўнутранай гармоніі чалавека.

Безумоўна, гэтыя фактары не маглі не паўплываць і на светаўспрыманне творчай інтэлігенцыі. Справа ў тым, што дынаміка жыцця заўсёды аказвае ўздзеянне на характар творчай дзейнасці, бо кожны творца працуе ў рамках існуючага сацыякультурнага цыкла.

Пад творчай асобай маецца на ўвазе чалавек, які мае мастацкія здольнасці і здатны шляхам назірання або камбінавання знаходзіць новы парадак у хаосе навакольнага свету — інакш кажучы, у свеце формаў, сімвалаў або семантычных аб'ектаў асобнай грамадскай культуры, ператвараючы іх у асабістую духоўна-інтэлектуальную спадчыну.

Аналіз спецыяльнай літаратуры дазваляе вызначыць спецыфічныя рысы творчай асобы: 1) абстрагаванне; 2) рухавасць мыслення; 3) крытычнасць думкі; 4) лёгкасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

генерыравання ідэй; 5) нестандартнасць мыслення; 6) здольнасць да хуткага пераключэння ўвагі; 7) перанос вопыту; 8) практычнасць мыслення; 9) самастойнасць мыслення; 10) здольнасць развіваць ідэю; 11) творчае ўяўленне і фантазія; 12) сістэмны падыход да праблем і інш.

"Задача творцы, — казаў яшчэ Бузоні, — заключаецца ў стварэнні новых законаў, а не ў тым, каб выконваць старыя, усталяваныя іншымі законы. Творчая моц спасцігаецца па тым, у якой ступені чалавек здатны адысці ад традыцый. Аднак свядомы адыход ад усялякіх правіл сам па сабе яшчэ не з'яўляецца творчасцю, і яго недастаткова для стварэння твораў мастацтва".

Неабходнай умовай выяўлення і развіцця творчага патэнцыялу асобы, механізмам рэалізацыі творчых здольнасцей з'яўляецца творчая актыўнасць, якая праяўляецца ва ўнутранай "рухавасці" асобы, яе мабільнасці і магчымасці хутка рэагаваць на змяненні ў навакольным свеце.

Што ж адбываецца з творчай асобай у эпоху панавання "масавай свядомасці"? Відавочна, што "масаваму грамадству" патрэбна адпаведнае мастацтва, і творца не можа ігнараваць гэтага факта. Падабаецца яму гэта ці не, але ва ўсялякім выпадку творца застаецца ўцягнутым у вір масавай культуры. Ён гэтак жа, як і звычайныя людзі, выкарыстоўвае прызначаную яму порцыю прызнаных масавых прадметаў і эталонаў прыгажосці; ён удзельнічае ў вялікім шоу спажывання мастацтва. Акрамя таго, што ён міжвольна спажывае прадметы масавай культуры і перапрацоўвае іх у сваёй свядомасці, сучасны мастак яшчэ і сваімі ўласнымі творамі аказвае ўплыў на ход развіцця гэтай масавай культуры. "Схільнасць да таго, каб не ствараць, а майстраваць музыку, захапіла нават самых таленавітых кампазітараў маладога пакалення", — справядліва адзначае Тэадор Адорна (1). Аднак паралельна з гэтым творца павінен адчуваць, хаця б у сваёй спецыяльнай галіне, паступовае знікненне эстэтычных каштоўнасцей і сваю прыналежнасць да гэтага дзеяння. Але разам з тым такое становішча многім можа чымсьці падабацца. Сама ідэя смерці мастацтва захапіла не толькі крытыкаў і мастацтвазнаўцаў, але і саміх творцаў, якія адчувалі, паводле А. Моля, "мазахісцкае задавальненне" ад думкі, што яны далучаны да "пагібелі багоў". Асобныя героі культурнай эпохі постмадэрнізму здолелі давесці распад мастацкіх нормаў да кульмінацыі: так, у 1960 г. у Нью-Йорку быў арганізаваны "канцэрт" з гукаў, якія стварала сама аўдыторыя (5).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кожны творца вымушаны шукаць нечага новага ў сваёй галіне. Твор мастацтва – гэта зварот мастака да іншага чалавека, ролю якога раней выконваў знаўца, а цяпер выконвае спажывец. Мастацкі твор для апошняга ўвасабляе нейкі прымальны кампраміс паміж банальнасцю зразумелага і арыгінальнасцю новага. Пункт раўнавагі паміж гэтымі двума дыялектычна супрацьлеглымі полюсамі не супадае для творцы і спажыўца, аднак агульнапрынятыя меркаванні, без якіх не могуць устойліва існаваць творы мастацтва, размяркоўваюцца ў пэўных межах і могуць быць апісаны ў эстэтыцы.

Калі мастацкае паведамленне змяшчае ў сабе семантычную частку, якую можна перакласці на іншую мову, і "неперакладальную" эстэтычную частку, то ўзровень складанасці, прымальны для спажыўца і дацушчальны для творцы, у абодвух выпадках абмежаваны магчымасцямі чалавечага розуму, які ў спажыўца па вызначэнні "сярэдні", а ў творцы – "геніяльны". Пераход ад узроўню творцы да ўзроўню спажыўца лепш за ўсё забяспечваецца вульгарызацыяй мастацтва і выданнем даведнікаў па калекцыях мастацкіх твораў (5).

Паступова распаўсюджваецца новая хвароба тэхнічнай цывілізацыі – адасабленне культуры. Спажывец усё далей адыходзіць ад аўтара, ён усё больш мае неабходнасць у пасрэдніках у выглядзе інтэрпрэтатараў, разнастайных сродкаў масавага распаўсюджвання мастацтва, ён зусім адвыкае ад нечаканага, адвольнага. Распаўсюджваюцца культура "кічу", культура "стандартных цэн", мазаічная культура, заснаваная на патоку не звязаных у сэнсавым плане элементаў, якія кожную секунду атакуюць наша ўспрыманне.

У выніку ўзнікаюць, умоўна кажучы, дзве незалежныя супольнасці. Першая амаль суцэльна складаецца са спажыўцоў мастацтва і машыннай прадукцыі: цікавасць да матэрыяльных каштоўнасцей у "грамадстве заможнасці" паступова зніжаецца, а роля культуры ўзрастае. Другая супольнасць складаецца з інтэлектуалаў і творчых работнікаў, якія схільныя да аскетызму і звяртаюцца да мастацтва, дзе вялікае значэнне мае камбінаторыка (так званае "пермутацыйнае мастацтва"). Мастак вядзе гульню, вяртаючы сабе свабоду і індывідуальнасць ва ўласнай рэальнасці, адасобленай ад "масавага грамадства", але, тым не менш, прадукты яго дзейнасці не пазбаўлены пэўнай сацыяльнасці.

Як адзначае А. Ерамееў, для таго каб з'явілася мастацтва, магчымасць яго нараджэння павінна спалучыцца з сацыяльнай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

неабходнасцю ў ім, з узнікненнем грамадскай патрэбы ў мастацтве (3).

"Мастацтва, — казаў яшчэ Л. С. Выгоцкі, — гэта грамадская прылада, пры дапамозе якой у кола сацыяльнага жыцця ўцягваюцца самыя інтымныя і самыя асабістыя бакі нашай існасці. Больш правільным было б сказаць, што пачуццё не становіцца сацыяльным, а наадварот, яно становіцца асабістым, калі кожны з нас перажывае твор мастацтва, становіцца асабістым, не губляючы пры гэтым свайго сацыяльнага значэння"(2).

У новым разумснні мастацтва больш не з'яўляецца непасрэдным адлюстраваннем рэчаіснасці, як было прынята лічыць раней. Мастацтва — гэта своесаблівая паралельная рэальнасць са сваімі законамі і правіламі, формамі і сэнсамі. Дон-Кіхот, Фаўст, Дзевятая сімфонія Бетховена або "Чорны квадрат" Малевіча — новыя рэальнасці, якія не маюць аналагаў у прыродзе. Яны маюць свой лёс і здольныя аказваць значны ўплыў на жыццё людзей.

Характэрнымі рысамі сучаснага мастацтва з'яўляюцца шматлікія элементы творчасці, пералік якіх мастаку паведамляе мастацтвазнаўца, і складанасць правіл "кампаноўкі", пры дапамозе якіх з элементаў ствараюцца структуры. Сучаснае мастацтва прэтэндуе на тое, што яно выйграла вялікую бойку за вызваленне ад перажыткаў эпохі. Перафразіруючы вядомага італьянскага кампазітара Берыо, можна сказаць, што "мастацтвам з'яўляецца ўсё тое, што ўспрымаецца і ацэньваецца як мастацтва". Такая пазіцыя супрацьстаіць меркаванню Гейнэ, які сцвярджаў: "Сапраўднае мастацтва павінна працінаць сэрца". Большая частка мастацкіх твораў сучаснай эпохі прызначаецца хутчэй для рацыянальнага аналізу, а не для пачуццёвага ўспрымання. Улічваючы тое, што прадметы мастацтва ствараюцца зараз у значнай ступені ў якасці аб'екта капіравання, даводзіцца адзначыць, што яны застаюцца арыгінальнымі толькі на працягу пэўнага часу.

Удакладняючы змест творчасці, трэба мець на ўвазе, што з трох асноўных формаў (мастацкай, навуковай, тэхнічнай) цяпер на першы план упэўнена выходзіць тэхнічная творчасць. Яна змяшчае ў сабе навуковую пазнавальную творчасць і радыкальна змяняе змест мастацкай. Найноўшая творчая парадыгма — гэта навукова-тэхнічная інавацыйная дзейнасць (4).

І ўсё ж такі пасля абясцэньвання сістэмы каштоўнасцей, якія мастацтва назапашвала стагоддзямі, мастак яшчэ можа стаць пераможцам у дадзенай сітуацыі, можа выратаваць сваё адчуванне сэнсу жыцця. Па-першае, у яго застаецца "гульня ў бісер" — інакш кажучы, ён можа адмовіцца ад сваёй сацыяльнай функцыі. Ён можа пачаць займацца мастацтвам для сябе, паступова эвалюцыяніруючы да абсалютнага эзатэрызму, пакуль грамадства не здагадаецца перастаць яго матэрыяльна падтрымліваць. Тут усё будзе залежаць ад тактыкі барацьбы паміж тымі, хто рэкламуе мастака, і фінансавага кантролю з боку мецэнатаў мастацтва. Іншае магчымае рашэнне: творцы алгарытмаў будуць насычаць культурную прагу насельніцтва, тэхнакраты — забяспечваць аптымальнае размеркаванне мастацкіх твораў па розных слаях сацыякультурнай піраміды. Трэцяе рашэнне — шлях стварэння новых відаў мастацтва (5).

Мастацтва цяпер ніяк не зводзіцца да сукупнасці прадметаў з умоўнымі ярлыкамі "твораў мастацтва" (як можна было б падумаць пры наведванні музеяў). Сучаснае мастацтва – гэта перш за ўсё жывая творчая думка. Важнае месца ў дзейнасці сучасных творцаў займае эксперымент. Творчасць у сённяшнім разуменні – працэс, а не проста часовая ўспышка натхнення генія. Першынство цяпер належыць творчаму праекту, а не яго рэалізацыі.

Мастацкая творчасць становіцца перш за ўсё спосабам свабоднага разважання аб жыцці, яно прыўносіць у свет аб'екты, якіх раней у ім не існавала. Гукавыя, візуальныя, літаратурныя, рухавыя формы набываюць самастойнае існаванне. Раскаванасць, "творчы дух", памкненне да выхаду за рамкі традыцыйных стыляў – вось спецыфічныя рысы мастацтва нашых дзён. Матэрыял адасабляецца ад формы, і мастацтва заключаецца перш за ўсё ў стварэнні ідэі, якая абстрактна выражаецца сістэмай правіл, што абмяжоўваюць свабоду камбінавання элементаў. Творчасць паўстае як сістэматычнае эксперыментаванне з мэтай выпрабаваць усе магчымыя варыянты ўвасаблення першаснай ідэі.

Шырокая сфера творчай дзейнасці, адлюстроўваючы ў сваёй структуры новы стан наваколля, садзейнічае нараджэнню іншага светаўспрымання, якое адаптуе чалавека да гэтага наваколля, дазваляе лепш асэнсаваць сучасную сітуацыю і выпрацаваць адпаведную ёй логіку існавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*1. Адорно Т.* Введение в социологию музыки. — М., 1973. — Вып.2. — С. 108.

*2. Выготский Л.С.* Психология искусства. — М., 1965. — С. 326—327.

*3. Еремеев А.Ф.* Границы искусства. — М., 1987. — С. 163.

*4. Кутырев В.А.* Осторожно, творчество! // Вопр. философии. —1994. —№ 7-8. — С. 74—75.

*5. Моль А., Фукс В., Касслер М.* Искусство и ЭВМ. — М., 1975. — С. 265 —273.

*6. Пантурин В.А.* Внутренний мир личности и искусство. — Свердловск, 1990. — 211 с.

*7. Психология масс:* Хрестоматия. — Самара, 1998. — 592 с.

**Ю.Г.Болатава,**
*выкладчык*

## КНІГА БЕЛАРУСІ — 2000

У канцы XX ст. сцвердзілася ўяўленне аб кнізе як з'яве сінтэтычнай, неаднароднай.

Кнігазнаўствам, культуралогіяй, сацыялогіяй у рознай меры даследаваны тыя ці іншыя аспекты сістэмы кнігі, аднак яе філасофска-культуралагічнае вывучэнне яшчэ чакае даследчыкаў. Мы не прэтэндуем на канчатковы і ўсебаковы аналіз сучаснай кнігі. Але ў гэтым артыкуле паспрабуем прааналізаваць самыя відавочныя, на наш погляд, тэндэнцыі кніжнай культуры Беларусі на парозе XXI ст. Лічым, што гэта будзе цікава і карысна.

Да нашага часу ў чалавецтва склалася ўяўленне аб кнізе як бясспрэчнай культурнай каштоўнасці. Менавіта ў "кнізе кніг" Бібліі і ў іншых свяшчэнных кнігах распавядаецца аб стварэнні свету і яго ўпарадкаванні, замацаваны асноўныя запаведзі і жыццёвыя нормы. Кніга была свяшчэнным дарам і ў той жа час дзейсным зводам усяго назапашанага людзьмі вопыту. Гэта наша спадчына, нашы традыцыі. Дзякуючы кнізе ажыццяўляліся зносіны паміж пакаленнямі і народамі. Кніга, перадаючыся з пакалення ў пакаленне, распаўсюджваючыся ўсё ў новых і новых землях, удасканальвалася, сеяла зерне ведаў і дабра. Гэтыя яе якасці, разам з рэдкасцю і недаступнасцю, надалі кнізе статус феномена, які захаваўся да нашых дзён.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ